# Педагогіка

А.Э. ПАПОВА

## ДЫДАКТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫКЛАДАННЯ ІНФАРМАТЫКІ ГІСТОРЫКАМ

This article is dedicated to problems of teaching Informatics to the students of the History Department, in particular, to elaboration of effective technology of training regarding factors of favourable surroundings for training.

Большасць выкладчыкаў прызнаюць шырокі дыяпазон дыдактычных уласцівасцей і адпаведна вынікаючых з іх функцый камп'ютэра і інфармацыйных тэхналогій (IT). Аднак мала хто прымяняе ў працы камп'ютэрныя тэхналогіі ў сувязі з наступнымі абставінамі: а) недахопам тэорыі аб інтэрактыўным навучальным асяроддзі; б) недахопам арганізацыйнай гібкасці адукацыйнай сістэмы; в) адсутнасцю дасканалых навыкаў валодання персанальным камп'ютэрам (ПК). І, як вынік – псіхалагічнае неўспрыманне, насцярожанасць выкладчыкаў у адносінах да камп'ютэрных тэхналогій, нежаданне адаптаваць свае стылі і метады навучання. Узнікае неабходнасць сістэматычнай і мэтанакіраванай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі педагагічных кадраў, якая складаецца з вывучэння магчымасцей працы на камп'ютэры і выкарыстання IT у сваёй прафесійнай дзейнасці.

Узнікшая "на стыку" інфарматыкі, крыніцазнаўства і квантытатыўнай гісторыі гістарычная інфарматыка (ГІ) (гл. Историческая информатика 1998, 11–20) абапіраецца на сучасную канцэпцыю інфарматызацыі (В.М. Глушкоў, А.І. Ракітаў, А.Д. Урсул) і ўключае прымяненне камп'ютэра і IT не толькі як сродкаў навучання па прадметах гістарычнага профілю, але і як аб'екта вывучэння. Яна базіруецца на ідэях праграміраванага навучання (В.П. Бяспалька, П.Я. Гальперын, Н.Ф. Талызіна), камп'ютэрызацыі навучання і выкарыстання сучасных IT у адукацыі (С.А. Бешанкоў, А.І. Бочкін, Б.С. Гершунскі, А.П. Яршоў, Э.І. Кузняцоў, Н.У. Макарава, Я.І. Машбіц, Я.С. Полат), а таксама на набыты станоўчы вопыт (У.Н. Сідарцоў, А.М. Балыкіна, В.Л. Ліпніцкая, Л.І. Бародкін, З.А. Джаліашвілі, Ю.Ю. Юмашава) (гл. Опыт компьютеризации 1999).

Інфарматыка і IT у адукацыі гісторыка валодаюць разнастайным патэнцыялам, бо яны змяняюць: 1) змест адукацыі, уводзячы новую вучэбную дысцыпліну, а таксама цэлы шэраг сумежных курсаў; 2) асяроддзе навучання, уводзячы прынцыпова новы для гісторыка элемент – персанальны камп'ютэр; 3) методыку выкладання асноўных дысцыплін, выступаючы пры гэтым як аснова для павышэння эфектыўнасці навучання; 4) змястоўнасць дзейнасці выкладчыка, яго прафесійныя характарыстыкі; 5) характар вучэбнай дзейнасці студэнта.

Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ўздзейнічаюць на ўсе кампаненты сістэмы адукацыі: мэты, змест, метады, формы, сродкі, што дазваляе вырашаць такія складаныя і актуальныя задачы педагогікі, як развіццё інтэлек-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

туальнага, творчага патэнцыялу асобы і яе навуковага, канструкгыўна-вобразнага, прасторавага і асацыятыўнага мыслення, камунікатыўных здольнасцей, самастойнасці. У сувязі з гэтым наша задача заключаецца ў тым, каб вызначыць тыя ўмовы, пры якіх будучы педагог здолее зразумець, вывучыць, авалодаць усімі магчымасцямі ІТ, якія дазваляюць інтэнсіфікаваць яго дзейнасць і, што немалаважна, назапасіць творчы вопыт у працы з ПК.

Першым крокам пры вырашэнні пастаўленай задачы было ўвядзенне ў 1992 г. на гістарычным факультэце БДУ курса "Гістарычная інфарматыка" (гл. Балыкина 1994), які з'яўляецца найбольш важным фактарам уздзеяння інфарматыкі і ІТ на змест гістарычнай адукацыі. Гэта дысцыпліна патрабуе іншага падыходу як у выкладанні, так і пры вывучэнні матэрыялу, дапускае адпаведную псіхалагічную арганізацыю навучэнца, улік асаблівасцей менталітэту гісторыка, для якога зносіны з камп'ютэрам – гэта якасна новы ўзровень зносін, магчымасці якіх не абмежаваны і далёка яшчэ не раскрыты. Набыты вопыт дазволіў распрацаваць па гэтай дысцыпліне тыпавую вучэбную праграму, якая была зацверджана Міністэрствам адукацыі РБ у 1995 г. (гл. Гістарычная інфарматыка 1995).

Ужо першы год навучання паказаў, што ГІ садзейнічае вырашэнню адной з актуальных праблем вышэйшай школы – праблемы інтэграцыі "дзвюх культур" (гл. Сноу 1973), бо менавіта гэты курс валодае агульнагуманістычным значэннем, раскрывае для гісторыка яшчэ адзін бок успрымання свету, а таму ён і павінен займаць асобнае месца сярод традыцыйных курсаў у адукацыйных стандартах і вучэбных планах гістарычных спецыяльнасцей. Наступным крокам з'явілася распрацоўка найбольш эфектыўнай тэхналогіі навучання па курсу ГІ з улікам псіхолага-педагагічных, арганізацыйных, камунікатыўных і асабістых аспектаў узаемадзеяння паміж выкладчыкам, студэнтам і ПК, а таксама навізны прадмета для гісторыка і яго "гуманітарнага складу мыслення". На нашу думку, дадзеная тэхналогія павінна забяспечваць не толькі якаснае засваенне вучэбнага матэрыялу навучэнцамі, але і садзейнічаць іх асабістаму развіццю – развіццю інтэлектуальнай і эмацыянальнай сфер, упэўненасці ў дзеяннях, самастойнасці, самаўдасканальвання.

Працэс распрацоўкі тэхналогіі навучання складаецца з трох этапаў (падрыхтоўчы, асноўны, заключны). У ходзе падрыхтоўчага этапу выкладчык праводзіць аналіз зместу навучання і, зыходзячы з яго, выяўляе мэты і задачы. Асноўны этап патрабуе дакладнага адбору і структуравання вучэбнага матэрыялу, падрыхтоўкі прыкладаў і заданняў, накіраваных на фарміраванне ўменняў і навыкаў. Вельмі істотнае значэнне на дадзеным этапе мае выбар форм арганізацыі вучэбнага працэсу, метадаў і сродкаў навучання, а таксама спосабаў кантролю за навучэнцамі. На трэцім, заключным, этапе адбываецца рэалізацыя зваротнай сувязі. Мы адказваем на пытанне, ці ўмее студэнт абыходзіцца з ПК, ці ведае ён магчымасці выкарыстання праграмнага забеспячэння. Такім чынам, адбываецца дыягностыка вынікаў навучання, а разам з тым і карэкціроўка тэхналогіі. Кожны з элементаў тэхналогіі займае сваё месца ў вучэбна-метадычным комплексе, створаным з мэтай павышэння эфектыўнасці працэсу выхавання вучэбна-пазнавальнай самастойнасці студэнтаў-гісторыкаў.

З мэтай дасягнення пастаўленых задач сістэму навучання ГІ мэтазгодна ажыццяўляць на аснове модульнага прынцыпу пабудовы: уводны курс (вывучэнне ПК і сучасных ІТ), базавы курс (ІТ і выкладанне гісторыі, камп'ютэрныя тэхналогіі навучання), спецыялізаваныя курсы (пашырэнне і паглыбленне прадметнай вобласці базавага курса). Модульнае ўяўленне дазваляе аптымізаваць вучэбны працэс, дае палёгку ў фарміраванні праграм, прадстаўляе магчымасць арганізаваць дакладную сістэму кантролю, ажыццявіць напаўненне кожнага модуля педагагічным зместам, выявіць і ўлічыць сувязі



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

модуляў і іх суадносіны з іншымі прадметамі. Фундаментам гэтай сістэмы з'яўляецца ўводны курс П.

У выніку праведзенага намі даследавання быў выяўлены рад фактараў, якія ўплываюць на эфектыўнасць тэхналогіі навучання, а менавіта: 1) адаптацыя студэнтаў малодшых курсаў да ўмоў вучобы ў ВНУ; 2) спецыфіка прадмета ГІ для гісторыкаў; 3) прафесійна-арыентаваная падрыхтоўка ў галіне інфарматыкі; 4) індывідуальныя асаблівасці навучэнцаў; 5) узровень школьнай падрыхтоўкі ў вобласці інфарматыкі; 6) адпаведнасць крытэрыям якасці вучэбнага тэксту; 7) абмежаванні вучэбнага плана (аб'ём гадзін). Разгледзім некаторыя з іх. Для вырашэння задач дыдактычнай адаптацыі неабходна вызначыць пытанні рацыяналізацыі і аптымізацыі самастойнай працы, удасканалення кантролю ведаў.

Поспех студэнтаў у многім залежыць ад паслядоўнасці і рэгулярнасці кантролю, які лепш арганізаваць наступным чынам: уводны кантроль (кантрольная праца на ПК, камп'ютэрны тэст); цякучы кантроль (вусны апрос па спецыяльна падрыхтаваных пытаннях); тэматычны кантроль (кантрольныя працы на ПК). Кантрольныя працы па пройдзеных тэмах дазваляюць разгрузіць іспыт па прадмету, падтрымліваць веды першакурснікаў на дастаткова высокім узроўні, актывізаваць самастойную працу студэнтаў); выніковы кантроль (залік ці іспыт у выглядзе вуснага адказу, камп'ютэрнага тэста і задання на ПК). Не менш важным для правядзення кантролю з'яўляецца ўсведамленне таго, што будзе падвяргацца кантролю: канчатковы вынік ці спосаб дзеянняў, якімі гэты вынік дасягаўся. Зразумела, што вынік пракантраляваць працей. А вось якім чынам выконвалася заданне навучэнцам, памыляўся ён і колькі разоў, які спосаб рашэння абраў, ці разумее ён тое, што робіць і г. д. – больш складаная справа.

Асаблівую ўвагу неабходна надаваць пытанням паляпшэння кіравання і распрацоўкі новых формаў самастойнай працы студэнтаў (СПС). У сфарміраваных умовах найбольш эфектыўнымі спосабамі актывізацыі і ўдасканалення СПС, на наш погляд, з'яўляюцца: напісанне вучэбна-метадычных дапаможнікаў (ВМД) згодна з прынцыпам узроўневай дыферэнцыяцыі; распрацоўка комплексу заданняў у адпаведнасці з тыпам самастойнай дзейнасці студэнта; складанне навучэнцамі праектаў рознага тыпу (сістэматызацыя і фармалізацыя ведаў у выглядзе табліц ці схем, стварэнне інструкцый па выкананню практыкаванняў пры вывучэнні тэм уводнага курса, вучэбных прэзентацый); арганізацыя ўмоў паспяховай работы (выдача графіка праходжання дысцыпліны, канкрэтнае выяўленне аб'ёму працы і арыентацыя студэнтаў на яе выкананне, рэгулярны кантроль).

Навізна прадмета інфарматыкі для гісторыка і яго "гуманітарны склад мыслення" патрабуюць найбольш спрыяльных абставін. Для гэтага працэс навучання канкрэтнаму праграмнаму забеспячэнню патрэбна разглядаць як працэс камунікацыі, які дапускае два правілы: уяўленне аб аб'екце камунікацыі і станоўчыя адносіны да яго. Такім чынам, для павышэння ступені засваення вучэбнай інфармацыі, актыўнасці навучэнцаў нам неабходна ствараць і падтрымліваць станоўчае стаўленне да камп'ютэра і ІТ, а таксама даць рэальныя веды аб іх магчымасцях.

Для ўмацавання самакіравання студэнтамі сваёй пазнавальнай дзейнасцю, развіцця мыслення, канцэнтрацыі ўвагі на лекцыях выкарыстоўваюцца спецыяльныя формы, якія змяшчаюць, з аднаго боку, кадры структураванай інфармацыі (матэрыял, падрыхтаваны выкладчыкам), а з другога – кадры каментарыя (месца для занясення інфармацыі студэнтам у працэсе чытання лекцыі).

Такую форму можна распрацаваць з дапамогай праграмы MS PowerPoint, якая дазваляе ствараць і дэманстраваць вучэбныя слайд-фільмы (прэзентацыі). Спецыяльнае дадатковае ўстройства да камп'ютэра дае



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

магчымасць кіраваць дэманстрацыяй адразу з клавіятуры і змяшчаць слайды ў прамым і адваротным накірунках, каменціруючы кожны кадр інфармацыі, запускаць аўтаматычны паказ прэзентацыі, пры гэтым для кожнага слайда можна зафіксаваць час паказу ў залежнасці ад яго вучэбнай значнасці. Прыемны эмацыянальны фон для ўспрымання вучэбнага матэрыялу (музычнае і мастацкае афармленне) стварае спрыяльныя ўмовы для паспяховага праходжання працэсу навучання.

Анкетаванне першакурснікаў і ўводны кантроль дапамагаюць выявіць узровень школьнай падрыхтоўкі ў вобласці інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі. Таму мэтазгодна распрацаваць пэўную сістэму пытанняў, практычных заданняў (асноўных і дадатковых) разнастайнага характару (з улікам асаблівасцей тэмпераменту, памяці, успрымання і г. д.). У выніку ствараюцца тры групы студэнтаў, згодна іх узроўню школьнай падрыхтоўкі: 1) нізкі ўзровень: уключае практыкаванні з падрабязным апісаннем выканання ўсіх дзеянняў і аперацый. Ступень падрабязнасці паступова памяншаецца; 2) сярэдні ўзровень: змяшчае практыкаванні, якія студэнты выконваюць практычна не абапіраючыся на апісанне, а таксама дадатковыя заданні; 3) высокі ўзровень: складаецца з заданняў той жа тэматыкі, але патрабуючых больш глыбокіх ведаў, уменняў і навыкаў працы на камп'ютэры і з праграмным забеспячэннем. Ёсць і комплекс дадатковых заданняў з апорай на даведачную сістэму.

У якасці асноўных сродкаў навучання на практычных занятках выкарыстоўваюцца вучэбна-метадычныя дапаможнікі (ВМД). Пры складанні практыкаванняў і заданняў, напісанні тэарэтычнай часткі ВМД важным з'яўляецца ўлік патрабаванняў якасці вучэбнага тэксту, гэта: складанасць, цяжкасць, чытабельнасць, функцыянальнасць і лагічнасць, псіхалагічнасць, педагагічнасць.

Выкананне вызначаных патрабаванняў дасягаецца праз інфармацыйнае ўзаемадзеянне аўтара і карыстальніка тэксту ў дачыненні аб'екта, які вывучаецца. У нашым выпадку ў якасці аўтара тэксту выступае выкладчык, у якасці карыстальніка – студэнт-гісторык, у якасці аб'екта – персанальны камп'ютэр і IT. Паміж імі ў працэсе навучання ўзнікае вучэбны дыялог, які кіруецца выкладчыкам непасрэдна і праз тэкст ВМД. Для эфектыўнасці дыялога патрэбен улік усіх залежнасцей паміж яго састаўляючымі. Тэкст змяшчае прадпісанні (інфармацыя+упраўленне і заданні), якія прадугледжваюць выкарыстанне рэальных дзеянняў за экранам камп'ютэра. Памылкі, пропускі, парушэнні паслядоўнасці могуць прывесці да блытаніны, непаразумення, страты інтарэсу да заняткаў. У выніку матэрыял заняткаў не будзе засвоены. Таму выкладчык павінен прадухіліць і забяспечыць вырашэнне ўсіх праблем (вынікі даследаванняў даюць магчымасць падлічыць, што ў 2/3 выпадкаў студэнты будуць рабіць зусім не тое, што задаваў і чакаў выкладчык (Якунин 1998, 320)). Таму ўся дзейнасць вучня і "дзейнасць" камп'ютэра павінны адэкватна адлюстроўвацца ў тэксце ВМД, спрыяючы стварэнню зручных умоў на практычных занятках.

Вопыт практычнай працы паказаў, што для забеспячэння патрабаванняў якасці вучэбнага тэксту пры складанні вучэбна-метадычных дапаможнікаў неабходна:

1. Выпрацаваць адзіную сістэму структурных элементаў тэксту, якія апісваюць тыя ці іншыя дзеянні. Пры арганізацыі працы з тэкстам важную ролю будзе адыгрываць яго візуальная культура – схемы, ілюстрацыі, піктаграмы, шрыфты, сімвалы (гл. падрабязней Вергасов 1972, Горелов 1980, Панов 1983). Гэтыя пазатэкставыя кампаненты вызначаюць асаблівасці прыёмаў засваення ведаў, узровень актыўнасці вучняў, развіццё мыслення, памяці, пазнавальных інтарэсаў, удакладняюць і дапаўняюць той вобраз дзеяння, які ствараецца тэкстам.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

2. Падрыхтаваць вучэбныя заданні, якія б былі зразумелыя і выконваліся студэнтамі, змяшчалі алгарытм дзеяння, дакладную стуктурную паслядоўнасць, элементы навізны, магчымасць своечасовага кантролю (поўная адпаведнасць вобраза на экране камп'ютэра з тым, шго змяшчае тэкст задання), карэкцыі.

3. Устанавіць, якія элементы вучэбнай інфармацыі часцей за ўсё выпадаюць з поля зроку студэнтаў, у якіх выпадках будзе магчымым узнікненне тыповай памылкі. Гэтаму спрыяе папярэдняя "абкатка" будучых вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

Рэалізацыя ўсіх зазначаных вышэй умоў дазваляе вучэбна-метадычнаму дапаможніку як сродку навучання выконваць наступныя дыдактычныя функцыі: фарміравання матывацыі, навучання, кантролю і карэкцыі, камунікацыі, развіцця.

Распрацаваная тэхналогія дазваляе рашыць наступныя задачы:

– сфарміраваць устойлівую матывацыю да вывучэння магчымасцей IT у прафесійнай дзейнасці, трывалыя веды працэсаў інфарматызацыі грамадства, гістарычнай навукі і адукацыі;

– зрабіць так, каб практычныя заняткі прыносілі больш задавальнення для студэнтаў і зменшыць іх працаёмкасць;

– забяспечыць разуменне прынцыпаў працы асноўных кампанентаў сучаснага праграмнага забеспячэння; сфарміраваць неабходныя навыкі хуткага засваення і дакладнага выкарыстання сістэмных і прыкладных праграм;

– узброіць уменнем ажыццяўляць падрыхтоўку артыкулаў, дакументаў рознага тыпу з выкарыстаннем тэкставых рэдактараў і элементаў дзелавой графікі; навучыць тэхніцы пошуку і апрацоўкі інфармацыі ў лакальных і сусветных камп'ютэрных сетках;

– рэалізаваць прынцып узроўневай дыферэнцыяцыі;

– сістэматызаваць вучэбны матэрыял для забеспячэння высокай прадукцыйнасці працы студэнтаў;

– выкарыстоўваць адначасова лагічную, зрокавую, слыхавую памяць;

– кантраляваць аўдыторную і пазааўдыторную самастойную працу і своечасова аказваць дапамогу;

– развіваць пазнавальную актыўнасць; накіроўваць інтэлектуальную дзейнасць першакурснікаў і ацэньваць іх інтэлектуальны рост;

– сфарміраваць уменне набываць веды і выкарыстоўваць іх у практычнай дзейнасці.

Такім чынам, курс гістарычнай інфарматыкі можа ўплываць на фарміраванне інфармацыйнай культуры педагога, калі:

1) для дасягнення павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў у галіне IT будзе выкарыстоўвацца эфектыўная тэхналогія навучання, распрацаваная на аснове комплекснага падыходу;

2) для дасягнення поспехаў у навучанні гісторыкаў па курсу ГІ будуць ствараца камфортныя абставіны, якія паспрыяюць пераадоленню пачуцця страху перад камп'ютэрам;

3) выкпадчык будзе павышаць інтарэс студэнтаў да вучобы з дапамогай тэхналогіі навучання, аснову якой складаюць ВМД, пабудаваныя па прынцыпу ўзроўневай дыферэнцыяцыі;

4) актывізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу будзе спрыяць рэгулярны кантроль, які праводзіцца па вызначанай схеме, а таксама эфектыўны кантроль за СПС;

5) з мэтай павышэння пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў будзе ўжывацца метад праектаў, які ў значнай ступені садзейнічае выпрацоўцы ўменняў і навыкаў самакантролю, саманавучання і самаразвіцця.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

ЛІТАРАТУРА

Балыкина Е.Н. Постановка вводного курса исторической информатики в Белорусском государственном университете // Компьютер и историческое знание: Сб. статей. Барнаул, 1994. С. 171–176.

Вергасов В.М. Активизация мыслительной деятельности студентов в высшей школе. Киев, 1972.

Гістарычная інфарматыка. Праграма для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасцях: Г.05.01.00 – Гісторыя, Г.05.02.00 – Гісторыка-архівазнаўства, Г.10.01.00 – Міжнародныя адносіны, Г.12.03.00 – Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры. Мн., 1995.

Горелов И.Н. Невербальные компоненты коммуникации. М., 1980.

Историческая информатика: Информатика для исторических специальностей: Учеб. пособие. Мн., 1998.

Опыт компьютеризации исторического образования в странах СНГ: Сб. статей. Мн., 1999.

Панов Е.Н. Знаки, символы, языки. М., 1983.

Сноу Ч.П. Две культуры. Сборник публицистических работ. М., 1973.

Якунин В.А. Педагогическая психология: Учеб. пособие. СПб., 1998.

***Папова Алена Эдуардаўна*** – старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*О.И. ЦАРЕВА*

## ИЗУЧЕНИЕ РУССКОЙ ПОЭЗИИ РУБЕЖА XIX–XX вв. В СРЕДНЕЙ ШКОЛЕ

The methodical system of Russian poetry study of (the end of the XIX – beginning of the XX centuries) in the 5–11 forms of secondary schools is adapted to school conditions. The study results can be used for scientific consideration of coordination of teaching Russian, Belarusian and the world literature.

Принятие новой Концепции литературного образования в Республике Беларусь (1991) обусловило внесение изменений в школьные программы. Теория и практика методики испытывают потребность в освоении новых тем и определении системных связей школьного курса на разных этапах литературного образования.

Одна из наиболее ярких страниц русской культуры – начало XX ст. Прочным эпитетом для эпохи рубежа XIX–XX вв. стало образное выражение "серебряный век". Различные дефиниции "серебряного века" находим у Н.А. Богомолова (Богомолов 1990), Е.Г. Эткинда (Эткинд 1989), Е.В. Карсаловой (Карсалова и др. 1996), Т.А. Бек (Бек 1997), Л.А. Рапацкой (Рапацкая 1996), Л.А. Трубиной (Трубина 1999), А.Н. Семенова и В.В. Семеновой (Семенов 2001) и др. Эпоха "серебряного века" русской литературы относится к одному из стабильных читательских приоритетов, в том числе читателей-подростков. В школьной практике закрепилось расширительное понимание метафоры "серебряный век", которая используется для качественной оценки духовно-культурной ситуации рубежа XIX–XX вв.

Сложность изучения данного раздела программы обусловлена рядом причин: 1) духовно-культурная ситуация конца XIX – начала XX в. не рассматривается по единому плану на всех этапах литературного образования; 2) не соблюдается принцип преемственности содержания и видов деятельности учащихся при изучении поэзии рубежа XIX–XX вв. в средних и старших классах; 3) изучение духовно-культурной ситуации рубежа XIX–XX вв. носит репродуктивно-иллюстративный характер; методические формы и приемы при изучении данного программного материала не отличаются разнообразием, не направлены на стимулирование творческой активности учащихся. В то же время есть все условия для изучения школьниками духовно-культурной ситуации рубежа XIX–XX вв. на более глубоком уровне: а) неподдельный интерес юных читателей, их желание узнать больше об эпохе "серебряного века"; б) близость духовно-культурной ситуации рубежа



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm